Хоміч Т. І., студ. гр. 311ФК і СКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# САЦЫЯЛЬНЫ АСПЕКТ ПАНЯЦЦЯЎ *СІРОЦТВА* І *ЎДАЎСТВО* (НА МАТЭРЫЯЛАХ МАЛЫХ ПРАЗАІЧНЫХ ЖАНРАЎ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як сведчаць этнаграфічныя звесткі XIX – пачатку XX ст., сіроцтва і ўдаўство былі дастаткова распаўсюджанымі з'явамі ў беларускім грамадстве. З-за недастатковай медыцынскай дапамогі, дрэннага харчавання, розных эпідэмій назіралася высокая смяротнасць сярод насельніцтва беларускіх губерній. Большасць сялянскіх сем'яў у XIX ст. мелі жыллё, якое ацяплялася па-чорнаму. Мужчыны, каб зарабіць грошай, наймаліся на розныя працы (лесапільныя, лесасплаўныя, каменацёсныя промыслы), з якіх вярталіся з падарваным здароўем. Асабліва сацыяльна неабароненымі з'яўляліся тыя, хто страчваў бацьку, маці ці мужа, не гледзячы на тое, што сялянская грамада аказвала дапамогу ўдовам і сіротам у час сяўбы, жніва, пакосу, брала на сябе выплату падаткаў і выкананне павіннасцей за карыстанне зямельнымі надзеламі [1, с.186].

Прыказкі, як сэнсава ёмістае ўвасабленне народнай маралі і этыкі, гавораць аб складаным становішчы названых груп насельніцтва. Неабходна адзначыць, што прыказцы характэрна канкрэтызацыя сітуацыі, канцэнтраванне на ёй увагі і ў той жа час абагульненне. Яна выдае гатовыя сціслыя формулы замест разгорнутых характарыстык. Таму разгляд паняццяў *сіроцтва* і *ўдаўство* праз прызму малых празаічных жанраў беларускага фальклору, з'яўляецца перспектыўным напрамкам у вывучэнні гістарычнай спадчыны беларусаў.

У зборніках беларускага фальклору зафіксавана нямала прыказак, у якіх вымалёўваецца складанае маральнае і матэрыяльнае становішча дзяцей, што страцілі бацькоў: *Не раз сірата кулаком слезы ўтрэ; Сіроцкую галоўку*

*дожджык мые; Сірата сіраце жаліцца, што хата валіцца; Як сіраце жаніцца, дык і ноч кароткая; Сіроцкая сляза і камень прабівае*; *Свет вялік, а сіраце дзецца недзе; Без маткі, без айца блукаецца, як аўца.* У іх адлюстроўваецца разуменне грамадствам пакрыўджанасці, сацыяльнай адрынутасці сірот. У прыказцы, *Як у полі асіна – так і сіраціна: яе вецер гне і мачыха б'е,* міфапаэтычнымі сродкамі падкрэсліваецца, што сірату з усіх бакоў крыўдзяць і зневажаюць. Прыводзіцца параўнанне з асінай – дрэвам, якое мае адметнае значэнне ў міфалагічных вераваннях беларусаў [2, с. 56]. Паводле беларускага этыялагічнага міфа, асіна спала, калі на ёй павесіўся Юда. Прачнуўшыся, яна вельмі спужалася вісельніка, затрэслася ад страху. З той пары на ёй увесь час трапечацца лісце.

Заслугоўвае ўвагі прыказка: *Як бацька памрэ, то палова сіраты, як маці памрэ, то цэлая сірата*. Гэты ўзор пацвярджае той факт, што галоўную ролю ў выхаванні дзяцей у сялянскай сям'і адыгрывала маці: на ёй ляжаў клопат аб фізічным доглядзе, кармленні дзяцей, ад маці пераважна ішло навучанне першым разумовым і фізічным навыкам ды інш. Таму страта маці з'яўлялася вялікім няшчасцем для дзяцей. Пасля смерці жонкі мужчына звычайна жаніўся, каб мець гаспадыню ў хаце. Няроднае дзіця адчувала да сабе, як правіла, больш жорсткія адносіны, чым роднае: *Дзень вялікі, а луста мала: не родная мамка ў торбу клала; Сіраце прыкіпіць і ў жываце; Свая матка, б'ючы, не заб'е, а чужая, гладзячы, загладзіць.* Фальклорныя творы розных жанраў і шматлікія этнаграфічныя звесткі ўвасобілі ў самых кранальных і лірычных вобразах долю сіраты [1, с. 123].

Пры вывучэнні прыказак пра сіроцтва можна знайсці шэраг узораў, у якіх акрамя канстатацыі сацыяльнага становішча сіраты выражаецца яго народна-хрысціянская трактоўка: *Бог сіротаў любіць, але долі не дае; Над сіратою Бог з калітою*. Існаванне варыянта прыказкі пра ўдаву – *Над удавою Бог з калітою* – вылучае блізказсць жыццевых становішчаў сіраты і ўдавы.

У зборніках беларускага фальклору змешчаны наступныя прыказкі пра ўдаву: *Удава – бедная галава; Удовіна і сякерка не сячэ і кабылка не вядзе;*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Баба без мужыка, як калёсы без каня; Удаву па двары пазнаеш; Без гаспадара жонка – заўседы сіротка,* выяўляюцца цяжкасці вядзення гаспадаркі адзінокай жанчынай. На Беларусі існаваў строгі падзел жаночых і мужчынскіх роляў, паводле якога мужчына выконваў самую цяжкую працу (араў, сеяў, вазіў і пілаваў дровы, рамантаваў пабудовы). Жанчына дапамагала мужу ў полі, вяла хатнюю гаспадарку, выхоўвала дзяцей. Удава была вымушана выконваць не толькі жаночую працу, але і мужчынскую. Заслугоўвае разгляду прыказка *Жыццё ўдавінае – савінае*. У гэтым прыкладзе ўдава параўноўваецца з сакральнай птушкай – савою, якая сімвалізуе жаночы пачатак, асацыюецца з захадам – сферай памерлых продкаў. Сава прылятае са свету памерлых у свет жывых і на сімвалічным узроўні даносіць веды да людзей [3, с. 549].

Паглыбляе асэнсаванне вобраза ўдавы ў беларускім фальклоры прыказка *Хто ўдаву мінае, той шчасце не мае*. Мы бачым прыпісванне ўдаве звышнатуральных характарыстак, чараў. Удава ў традыцыйнай культуры набывае асаблівы рытуальны і знакавы статус. Стан удавы супрацьпастаўляецца самой ідэі шлюбу – удовы не прымаюць удзел у вясельных рытуалах. Значным складальнікам рытуальнага статусу ўдавы становіцца яе абрадавая чысціня – адсутнасць палавых дачыненняў. Удовы як бязгрэшныя жанчыны бяруць актыўны ўдзел у пахавальных цырымоніях, іх заўсёды запрашаюць абмываць і ўбіраць нябожчыкаў. Асабліва вылучаецца рытуальная роля ўдоў у час аказіяльных экстрэмальных сітуацый [4, с. 463].

Аналіз прыказак дае важныя і цікавыя звесткі пра такія сацыяльныя з’явы беларускага грамадства, як сіроцтва і ўдаўство. Прыказкі адлюстроўваюць народны вопыт, нормы маралі і паводзін чалавека, дэманструюць розныя аспекты вывучаемых катэгорый. З прыказак мы бачым характэрныя рысы сіроцтва і ўдаўства: складанае матэрыяльнае становішча, сацыяльная адрынутасць, духоўная пакрыўджанасць. У малых празаічных жанрах фальклору назіраюцца хрысціянскія матывы і чалавечы скепсіс,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстроўваюцца гаспадарчыя традыцыі, вылучаюцца міфалагічныя ўяўленні адносна сіроцтва і ўдаўства.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Беларусы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – [Т.]6: Грамадскія традыцыі/[ В.Ф. Бацеяў, В.М. Бялявіна, А.У.Гурко і інш.]; Беларуская навука, 2002. – 606 с.

2. Беларускі фальклор: энцыклапедыя / рэдкалегія: Г.П.Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш. – Т1: Акапэла-Куцця, 2005. – 765 с.

3. Беларускі фальклор: энцыклапедыя / рэдкалегія: Г.П.Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш. – Т2: Лабараторыя - Яшчур, 2006. – 828 с.

4. Санько, С., Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік/С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004.-592 с.

5. Фядосік, А.С. Анталогія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі і выслоўя/уклад. А.С. Фядосік.- Мінск: Ураджай, 2002.- 298 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ